УДК 947.6 «17»

І.М. Рыжанкоў, аспірант

# УДЗЕЛ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў СТВАРЭННІ І ПРАЦЫ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ ЧАСОВАГА ЎРАДА (ВЯСНА–ВОСЕНЬ 1917 Г.)

The article dwells upon the activity of peasantry at the moment of the state power construction during 1917.

На пачатку 1917 г. грамадскае жыццё жыхароў гарадоў і мястэчак Беларусі, не занятай германскімі войскамі, знаходзілася пад кантролем вайсковых і ўрадавых структур. Па законах ваеннага часу ўсе антыўрадавыя мітынгі і сходы забараняліся, роўна як і забастоўкі на абарончых прадпрыемствах. Выданне газет і паштовая перапіска падлягалі цэнзуры. У тых умовах левыя партыйныя групоўкі (эсэры, бундаўцы і інш.) не выяўлялі адкрытай палітычнай актыўнасці і нелегальна дзейнічалі ў арганізацыях па абслугоўванні фронту, дапамогі бежанцам і беспрацоўным.

Сусветная вайна пакінула істотны адбітак на стане сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі. Мясцовыя ўлады ўсведамлялі, што беларускія губерні не адняосяцца да ліку рэгіёнаў з высокапрадукцыйнай сельскай гаспадаркай. Тым не менш яго працоўныя рэсурсы і харчовы патэнцыял актыўна выкарыстоўваліся для франтавых патрэб. У сваю чаргу, жыццядзейнасць сялянства пэўным чынам рэгламентавалася: за своечасовым выкананнем харчовых паставак і правядзеннем урадавых загадаў у жыццё назіралі адпаведныя органы – губернскія і земскія ўстановы, харчовыя камітэты і інш. У цэлым ход ваенных дзеянняў, бежанства, мабілізацыі працоўных рэсурсаў, шматлікія рэквізіцыі негатыўна адбіліся на агульным становішчы беларускага сялянства, але не разбурылі асноў яго гаспадарчай жыццядзейнасці. Яго роля ў грамадска-палітычным жыцці ўвасаблялася галоўным чынам у дабрачыннай дзейнасці на карысць фронту. Толькі пасля звяржэння самаўладдзя беларускае сялянства апынулася ў рэчышчы дзяржаўных мерапрыемстваў па ажыццяўленні наспелых, у тым ліку палітычных, задач.

Утварэнне губернскіх і павятовых камісарыятаў Часовага ўрада мела прыкметы трансфармацыі старых органаў улады ў новыя, бо, з аднаго боку, на чале іх апынуліся прадстаўнікі ранейшай палітычнай эліты, а з другога – у іх склад былі <u>абраны</u> (падкрэслена намі. – *І.Р.*) прадстаўнікі розных сацыяльных, канфесійных, нацыянальных і іншых пластоў. Так, рэарганізацыя мясцовых органаў дзяржаўнай улады пачынаецца 4 сакавіка 1917 г. з публікацыі тэлеграмы старшыні Савета міністраў Часовага ўрада Г. Львова, паводле якой былі скасаваны пасады губернатараў, віцэ-губернатараў і земскіх начальнікаў, а на базе апошніх – заснаваны інстытут губернскіх і павятовых камісарыятаў [1, арк. 15]. У выніку пасады губернскіх камісараў занялі былыя старшыні земскіх упраў: у Мінскай – Б. М. Самойленка, Магілёўскай – В. А. Судзілоўскі, Віцебскай – М. Л. Карташоў. Менавіта іх намаганнямі (праз адозвы, губернскія органы друку, службовыя тэлеграмы) пачынаецца першы этап прыцягнення сялян да ўдзелу ў дзяржаўных справах. Разам з фарміраваннем камісарыятаў губернскага і павятовага ўзроўняў пастановай ад 20 сакавіка Міністэрства ўнутраных спраў былі заснаваны ніжэйшыя ўрадавыя органы на вёсцы – валасныя камітэты [2, арк. 36–39]. У іх кампетэнцыю ўваходзілі наступныя пытанні: харчовая і працоўная дапамога арміі, захаванне цэн (зацверджаных Часовым урадам) на харчаванне і аплату працы парабкаў, забеспячэнне насеннем палёў, размеркаванне паміж гаспадаркамі ваеннапалонных, барацьба з дэзерцірамі, падтрымка грамадскай бяспекі, недапушчэнне самачыннага вырашэння зямельнага пытання і г. д. [3, с. 134–135]. Закладзены ўрадам прынцып прапарцыянальнага прадстаўніцтва прадугледжваў ажыццяўленне выбараў наступным чынам: кожны сельскі ці местачковы сход выбіраў па аднаму члену на 300 жыхароў у валасны савет, а савет абіраў 15 членаў у валасны камітэт.

Урадавыя інструкцыі падмацоўваліся грунтоўнай агітацыйна-прапагандысцкай пра-

цай дзяржаўных і грамадскіх структур, інтэлігенцыі, а таксама асобных дзеячаў-энтузіястаў. Вядома, што ў сакавіку вяскоўцы атрымоўвалі рэдкія і выпадковыя звесткі аб пераменах у краіне, якія паступалі з горада, ад святароў, вайскоўцаў, служачых Усерасійскага Земскага Саюза і Усерасійскага Саюза Гарадоў. Праз месяц, дзякуючы намаганням урадавых структур, мясцовай дэмакратыі, партыйных агітатараў, земскіх начальнікаў, настаўнікаў, салдат, семінарыстаў, сяляне ўсведамлялі неабходнасць пераабрання органаў улады. Адначасова, як зазначалася ў міністэрскай справаздачы, «вёска стала адчуваць і ўспрымаць ідэі і праграмы, выпрацаваныя і прынятыя ў гарадскіх цэнтрах» [4, арк. 2].

Можна меркаваць, што сяляне не адразу ўсведамлялі значнасць свайго ўдзелу ў выбарах новых валасных камітэтаў. Асэнсаванне імі сваёй грамадзянскай і палітычнай ідэнтычнасці толькі пачыналася. Таму невыпадкова валасныя сходы працягваліся яшчэ ў маі і не з'яўляліся такімі масавымі, як у сакавіку, падчас абвяшчэння царскіх Маніфестаў. Нават у чэрвені сваю заклапочанасць нізкімі паказчыкамі арганізацыі валасных камітэтаў адзначылі ўдзельнікі з'езда (чэрвень) Саветаў салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў Віленскай губерні. З гэтай нагоды была прынята пастанова аб найхутчэйшай арганізацыі аднатыпных валасных камітэтаў.

У адрозненне ад Віцебшчыны, сяляне Гомельскага павета бралі актыўны ўдзел у валасных выбарах. Мала таго, з самага пачатку іх актыўнасць стала набываць палітычнае адценне. Як пісаў павятовы камісар Г. Калашнікаў, «палескія беларусы, каліс্цы ціхія і пакорныя, з далечыні імкнуліся трапіць на гарадскія сходы, запрашалі «аратараў», арганізаваліся ў сельскія і валасныя камітэты – усе ад малога да вялікага пайшлі ў палітыку». Нягледзячы на тое, што сялянства мела вопыт выбарнасці – удзел у выбарах у Дзяржаўную думу, іх светапогляд змяшчаў архаічныя рысы абшчыннай ментальнасці. У прыватнасці, падчас выбараў «камісара ў стане» сяляне адной з вёсак названага рэгіёна «адхілілі кандыдата з прозвішчам Каралёў, якое нагадвала ўдзельнікам схода мінулы лад». «Не трэба нам караля, нам патрэбна сумленнага, простага чалавека!» – казалі яны [5].

Паралельна адбывалася рэарганізацыя земскіх самакіраванняў. У ліку першых яна прайшла ў Гомелі і Оршы, дзе пасля адстаўкі старшынь земскіх упраў новыя былі папоўнены прадстаўнікамі ад сялян і дэмакратычных груп. У далейшым з удзелам членаў губернскага і павятовага земстваў праходзіла фарміраванне Магілёўскага губернскага выканаўчага камітэта.

Пасля ўтварэння валасных камітэтаў асобныя іх прадстаўнікі ўключаліся ў склад павятовых камісарыятаў. Так, у Мазырскім выканаўчым камітэце (7 членаў) сяляне былі прадстаўлены дзвюма асобамі – Л. Дрыгам і А. А. Курылавам [6]. У Бабруйскім выканаўчым камітэце пераважную частку (22 супраць 14) складалі сяляне.

Прысутнасць сялянскага элемента ў губернскіх і павятовых камісарыятах (выканкомах) Беларусі залежала ад падыходу іх кіраўніцтва да гэтага пытання. На Віленшчыне толькі са стварэннем валасных камітэтаў стала магчымым фарміраванне губернскага камісарыята: 22 красавіка на з'ездзе валасных і гарадскіх камітэтаў з удзелам прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый быў абраны сялянска-рабочы выканком [7]. Найлепшым чынам было арганізавана прадстаўніцтва валасных камітэтаў з удзелам сялян у Мінскім губернскім камісарыяце. У любым выпадку камісары былі зацікаўлены ў найбольшым прадстаўніцтве ўсіх пластоў насельніцтва, у тым ліку сялян.

Трэба адзначыць, што важным фактарам, які паспрыяў утварэнню з удзелам сялян органаў улады на вёсцы, стала арганізацыя Саветаў сялянскіх дэпутатаў. У адрозненне ад салдат і рабочых, сялянства Беларусі арганізавалася значна пазней. Праведзеныя (у красавіку–чэрвені) сіламі мясцовай улады і «рэвалюцыйнай дэмакратыі» губернскія, павятовыя і іншыя з'езды сялянскіх дэпутатаў у сваіх рэзалюцыях ухвалілі праграмныя палажэнні Часовага ўрада, перш за ўсё ў падрыхтоўцы аграрнай рэформы, у скліканні Уста-

ноўчага сходу, таксама выказалі рашучую падтрымку ў арганізацыі валасных, зямельных камітэтаў, перапыненні зямельных канфліктаў і інш. [3, с. 371, 517].

Там, дзе не хапала энергіі ўрадавых структур, справай арганізацыі вёскі займаліся грамадскія і палітычныя аб'яднанні, якія ўсведамлялі важнасць гэтай працы для ўмацавання новага ладу. Так, напрыканцы мая прадстаўнікі Віцебскага губернскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў (члены ПС-Р) наведалі Лескавіцкую валасць, дзе правялі (разам з гутаркай па пытаннях барацьбы з вінакурэннем, харчовым крызісам і арганізацыі воласці да Устаноўчага сходу) рэарганізацыю валаснога камітэта [8].

Вядома, што першы склад валасных камітэтаў быў недасканалым у сэнсе прадстаўніцтва і вызначэння функцый. Таму невыпадкова па меры далейшай дэмакратызацыі і палітызацыі жыццядзейнасці грамадства, гэтыя органы не пазбягалі канфліктаў з існаваўшым заканадаўствам і спадзяваннямі Часовага ўрада. Так, ужо ў маі 1917 г. да камісараў беларускіх губерняў трапляе інфармацыя аб выданні валаснымі камітэтамі процізаконных пастаноў [9, с. 70]. Члены камітэтаў давалі дазвол на захоп і размеркаванне памешчыцкіх і казённых сенакосаў, лугоў і г. д. са спасылкай на рэзалюцыі сялянскіх з'ездаў, якія лічылі законам [10, арк. 11; 3, с. 380].

Зразумела, што рэзалюцыі грамадска-палітычных арганізацый – Саветаў дэпутатаў не мелі сілу абавязковага выканання. У сваю чаргу, валасныя камітэты, як адміністратыўна-выканаўчыя (дзяржаўныя) установы ў сваіх дзеяннях павінны былі кіравацца толькі адпаведнымі распараджэннямі павятовых і губернскіх камісараў і загадам Часовага ўрада. Але сялянам не ўласціва было праводзіць мяжу паміж установамі ў якіх удзельнічалі, яны імкнуліся скіраваць іх дзейнасць на сваю карысць і знайсці магчымыя сродкі, каб прыстасаваць закон для задавальнення сваіх эканамічных інтарэсаў.

У адказ на гвалтоўныя акцыі названых камітэтаў урад загадаў мясцовым камісарам «уступіць у шчыльнае супрацоўніцтва з Саветамі рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў у мэтах вылучэння здольных агітатараў» [11, арк. 165]. Неўзабаве сіламі савецкіх дзеячаў і ўрадавых чыноўнікаў была арганізавана камісія на чале з І. І. Мятліным і прадстаўнікамі ад Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Савета сялянскіх дэпутатаў і губернскага зямельнага камітэта, якая на сумесным пасяджэнні прызнала пастановы Барысаўскага валаснога камітэта процізаконнымі [2, с. 409]. Па ініцыятыве Полацкага павятовага камісара быў сфарміраваны «агітацыйны» камітэт, у які ўваходзілі: старшыня мірскога з'езда, суддзя, прадстаўнікі ад Савета сялянскіх дэпутатаў і валаснога камітэта [12, арк. 410].

Як адзначалася вышэй, валасныя камітэты павінны былі весці барацьбу з дэзерцірамі. Так, у Салюцкай і Веляшкоўскай валасцях Віцебскай губерні было вырашана пазбавіць «сямей дэзерціраў харчовых пайкоў, укрывальнікі за кожны дзень знаходжання ў іх дэзерціраў падвяргаліся штрафу ў памеры 50 рублёў» [13].

Сярод іншых праблем, якія давялося вырашаць Часоваму ўраду, было харчовае пытанне, у прыватнасці клопат аб будучым ураджаі. Адноўленыя і папоўненыя сялянскімі прадстаўнікамі губернскія, павятовыя, валасныя харчовыя камітэты і ўправы назіралі за своечасовым севам і зборам збожжавых культур, улікам і размеркаваннем прадуктаў харчавання франтавікам, гараджанам і інш. [14, арк. 132]. Дапускаючы магчымае зніжэнне памераў нарыхтоўкі хлеба прыватнымі землеўласнікамі (з прычыны небяспекі аграрнага руху), Часовы ўрад «Палажэннем аб ахове пасеваў» 11 красавіка ўсклаў на харчовыя камітэты наступныя задачы: ахова пасеваў, назіранне за землекарыстаннем, перадача сялянам у арэнднае карыстанне пуставаўшых прыватнаўласніцкіх зямель.

Па меры ўцягвання сялян у грамадска-палітычнае жыццё яны ўсё больш імкнуліся «прыстасаваць ідэі» Часовага ўрада да сваіх інтарэсаў [15, арк. 2]. Права «прымусовай перадачы» пустуючых зямель другім землеўласнікам сяляне тлумачылі як сваё выключнае права па назіранні і размеркаванні памешчыцкай зямлі. Сяляне праганялі з палёў парабкаў,

ваеннапалонных, травілі пасевы, лугі, каб мець падставы прызнаць палеткі пустуючымі ці незасеянымі і авалодаць чужой зямельнай уласнасцю [4, арк. 2; 9, с. 121, 123]. Пад прыкрыццём харчовых камітэтаў вяскоўцы захоплівалі і дзялілі прыватныя лугі, выпасы, сенакосы і інш. [9, с. 246]. Значную дапамогу ў гэтым аказвалі вайскоўцы, якія карысталіся ў сялянскім грамадстве вялікім аўтарытэтам. Так, у Мсціслаўскім павеце Магілёўскай губерні «40 салдат, узначаленыя членам валасной харчовай управы Ісачэнка, захапілі і раздалі сялянам 10 дзесяцін сенакосаў памешчыка Бубягі ў наваколлі Фення» [16, арк. 47].

Пагражаючую тэндэнцыю адзначыў начальнік забеспячэння фронту ген. Мінут: «некаторыя мясцовыя харчовыя камітэты выдавалі абавязковыя пастановы аб адабранні лугоў на карысць немаёмасных, чым выклікаюць паніку ў уладальнікаў пакосаў, у пасляховым зборы з якіх зацікаўлена армія». Таму ён быў вымушаны звярнуцца да губернскага і павятовых камісараў з патрабаваннем навесці парадак і «перапыніць незаконныя дзеянні зноў створаных урадавых устаноў, якія падрываюць гэтым аўтарытэт урадавай улады на месцах» [10, арк. 16].

Каб пазбегнуць магчымых перасячэнняў функцый валасных і харчовых камітэтаў, урадавай пастановай 21 красавіка былі створаны новыя дзяржаўныя органы – зямельныя камітэты. Задачай названых устаноў прызнавалася «высвятленне зямельнай патрэбы мясцовага насельніцтва і збіранне ўсіх неабходных звестак да Устаноўчага сходу, каб апошні, як толькі будзе скліканы, мог неадкладна і па ўсёй справядлівасці вырашыць зямельнае пытанне, прыняць да ўвагі ўсе мясцовыя патрэбы» [3, с. 267]. Прычым пастановы гэтых камітэтаў «па пытаннях сельскагаспадарчых зямельных адносін мелі абавязковы характар у межах дзеючага заканапалажэння» [14, арк. 132].

Напрыканцы мая – у пачатку чэрвеня зніжэнне тэмпаў арганізацыі зямельных камітэтаў і ўпраў занепакоіла Часовы ўрад, які аддаў загад з выпадку стварэння Галоўнага зямельнага камітэта з прадстаўніцтвам у ім адпаведных губернскіх структур. Характэрна тое, што ўрад не рэгламентаваў склад зямельных камітэтаў, аддаючы гэтае пытанне на разгляд мясцовых уладных і грамадскіх сіл. Як відаць, урадавы разлік на людское прызнанне новага ладу быў такім значным, што паралельна не было створана ніякіх дадатковых сілавых структур, каб перашкодзіць пашырэнню гвалту з боку сялянства. Першапачаткова планавалася, што губернскі зямельны камітэт будзе складацца з прадстаўнікоў губернскага выканкома і павятовых зямельных камітэтаў. Ад губернскага выканкома Міншчыны ў губернскі зямельны камітэт былі вылучаны П. Еўстратаў, П. Іваноў, Р. Скірмунт і селянін Юрыс (Навагрудскі павет) [17]. Адметна, што Мінская ўправа павятовага зямельнага камітэта цалкам была сфарміравана з сялян – К. І. Савіцкі-Мехедка (старшыня), І. І. Палежай, А. І. Жыбрык і А. Д. Багушэвіч. Але на чарговым пасяджэнні гэтага камітэта ў склад управы было вырашана «каптаваць міравога суддзю, агранома і статыста» [18]. У большасці выпадкаў ініцыятыва арганізацыі валасных зямельных камітэтаў «паступала ад мясцовага насельніцтва, часам камітэты «народнай улады» ўзнікалі выпадкова без выбараў» [4, арк. 2 зв.].

Пашыраны інтарэс да дзейнасці зямельных камітэтаў выяўлялі губернскія і павятовыя Саветы сялянскіх дэпутатаў. У маі–чэрвені да губернскага камісара ад сялянскіх з'ездаў Віленскай і Ковенскай губерняў паступілі «заявы ўключыць у губернскі зямельны камітэт 7 прадстаўнікоў з правам рашаючага голаса» [19, арк. 175]. Аналагічныя рашэнні былі прыняты (5 ліпеня) на нарадзе выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў: «для дэмакратызацыі губернскага зямельнага камітэта дэлегаваны 2 прадстаўніка ад Мінскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў – Міхайлаў і Маронка» [3, с. 447].

Зямельныя камітэты, як валасныя і харчовыя, выносячы незаконныя пастановы, абапіраліся на рэзалюцыі з'ездаў губернскіх і павятовых Саветаў сялянскіх дэпутатаў. Паводле даклада ў МУС Магілёўскага губернскага камісара М. Друцкага-Сакалінскага, «пас-

ля вяртання сялянскіх дэлегатаў з Усерасійскага з'езду сялянскіх дэпутатаў валасныя і павятовыя зямельныя камітэты склалі пастановы аб неадкладнай раздачы лугоў, якія належалі прыватным уладальнікам, у арэнднае карыстанне суседнім сялянам» [3, с. 360]. У сваю чаргу, камісары не мелі права прыпыніць пастановы зямельных камітэтаў, што ўскладняла барацьбу з аграрнымі парушэннямі.

У некаторых месцах зямельныя камітэты выконвалі функцыі харчовых камітэтаў па кантролі і размеркаванні незапатрабаванай зямельнай уласнасці. Так, Лепельскі павятовы і Гарадчэўскі валасны зямельныя камітэты прадпісалі землеўласніку Спасоўскаму «скасіць канюшыну і поплаў да 10 ліпеня, жытняе поле да 20 ліпеня, а канюшыну другога ўкосу да 5–10 верасня. У выпадку невыканання гэтага патрабавання камітэты пагражалі самавольна прадаць гэтыя ўкосы» [9, с. 126].

Адметна, што пастанова аб заснаванні зямельных камітэтаў не суправаджалася належнай інструкцыяй, гэта абумовіла адсутнасць адзінства ў тлумачэннях памераў правоў і паўнамоцтваў зямельных камітэтаў. Выдадзеныя 30 мая і 16 ліпеня міністэрскія інструкцыі не здолелі ў поўнай меры ўдакладніць іх «правы і паўнамоцтвы», што скарыстала сялянская большасць у зямельных камітэтах. Паводле апошняй інструкцыі, названыя камітэты мелі права перадаваць сялянам пустуючыя землі ў арэнднае карыстанне [14, арк. 134, 135 зв.].

У выніку замест установы, дзейнасць якой звужалася пытаннямі падрыхтоўкі праекта аграрнай рэформы і вырашэння аграрных спрэчак, зямельныя камітэты выступілі ў якасці арганізацыі з паўнамоцтвамі дзяржаўнага органа ўлады. Мабыць, таму не ўсялякі пісьменны селянін мог разабрацца ў тонкіх адрозненнях урадавых камітэтаў і трактаваў «законапалажэнні», маючы на мэце задавальненне ўласных эканамічных патрэб.

Натуральна, што процізаконныя дзеянні зямельных камітэтаў выклікалі адпаведную рэакцыю мясцовых сіл – урадавых (камісары і камісарыяты) і грамадска-палітычных (Саветы) арганізацый. Яшчэ напрыканцы мая на Міншчыне паўнамоцтвы зямельных камітэтаў некалькі скарэктаваны, было вырашана перадаць пытанні аб скаргах землеўласнікаў на патравы, парубкі і г. д. для разгледжання валаснымі камітэтамі. Па сутнасці, гэта была паўмера, недастатковая для перапынення азначанага руху, таму ў жніўні 1917 г. губернскі выканком «хадайнічаў перад Часовым урадам аб перадачы зямельных пытанняў у кампетэнцыю цэнтральнай улады» [20]. Выпадкі разбіральніцтва з судовым праследаваннем мелі месца ў некаторых валасцях Полацкага павета, дзе з дазволу зямельных камітэтаў пачалася масавая высечка лесу. Закліканыя старшынёй павятовага Савета ўзброеныя сілы прадухілілі злачынства. У выніку старшыні камітэтаў былі адхілены і аддадзены суду, а для барацьбы з анархіяй стварылі асобы камітэт. Але вядома, што большасць незаконных пастаноў заставаліся неразгледжанымі.

Такім чынам, заснаванне зямельных камітэтаў і пашыранае сялянскае прадстаўніцтва ў іх не прывялі да правільнай арганізацыі пазямельных адносін на вёсцы. Наадварот, надалі сялянскаму гвалту арганізаваны характар. Варта адзначыць прамыя суадносіны сялянскіх выступленняў з колькасцю валасных зямельных камітэтаў. У прыватнасці, у пачатку восені ў Мінскай губерні дзейнічала – 202, у Віцебскай – 196, Магілёўскай – 146 зямельных камітэтаў. Усяго губернскіх камітэтаў налічвалася 45, «што складала 95% у Еўрапейскай Расіі, павятовых 425, валасных 3115» [21, арк. 18].

Лютаўская рэвалюцыя істотна памяняла сістэму кіравання краінай, наблізіўшы яе да народа. Ва ўмовах новага, дэмакратычнага рэжыму ўзаемаадносіны сялянства і вярхоўнай улады перайшлі ў рэчышча дыялога суб'ектаў палітыкі. Згодна з выбарчым правам, сяляне як паўнавартасныя грамадзяне ўдзельнічалі ў заснаванні і працы дзяржаўных органаў улады. Не варта перабольшваць узрослы за час з лютага па кастрычнік 1917 г. узровень палітычнай (роўна як класавай або нацыянальнай) самасвядомасці беларускага сялянства, тым не менш сярод іншых рыс грамадскіх настрояў, якія яно (сялянства) прынесла з аджы-

тай эпохі самаўладдзя, заставаліся: перавага прыватнаўласніцкага (у межах сельскай абшчыны) інтарэсу над агульным (у межах дзяржавы і грамадства), а таксама законапаслухмянасць. Паслабленне дзяржаўнай улады і неразвітасць дэмакратычных інстытутаў толькі ўзмацнялі магчымасці мясцовых яе органаў для злоўжыванняў на карысць іх выбаршчыкаў.

У гэтым сэнсе працэс рэарганізацыі мясцовага кіравання меў свае ўласцівыя асаблівасці. Калі прысутнасць на выбарных пасадах першага складу значнай колькасці заможных элементаў, «служачых старога ладу», тлумачылася адсутнасцю «людзей», здольных выконваць кіруючыя функцыі, то ў далейшым «грамадзяне-земляробы» адносна хутка засвоілі карысць ад удзелу ў дзяржаўных установах. Шматлікія пастановы, загады, рэзалюцыі, трапляючы ў валасны, харчовы або зямельны камітэт, набывалі тэндэнцыйную інтэрпрэтацыю і выкарыстоўваліся ў інтарэсах сялянства. Нярэдка гэтыя ж органы выкарыстоўвалі прынятыя на сялянскіх форумах пастановы, якім вяскоўцы-абшчыннікі надавалі пэўную юрыдычную сілу. Так, імкненне Часовага ўрада да рацыянальнага выкарыстання пасяўных плошчаў і дазвол на перадачу сялянам пустуючых зямель урэшце прывялі да таго, што працоўныя вёсак самастойна і нават праз абраныя камітэты сталі ладзіць перашкоды памешчыкам у выкарыстанні імі наёмнай рабочай сілы для апрацоўкі сваіх угоддзяў, каб пакінуць іх неапрацаванымі і тым фармальна абгрунтаваць свае правы на іх (угоддзяў) захоп.

Можна меркаваць, што сялянства рознымі метадамі імкнулася да паляпшэння свайго эканамічнага стану за кошт памешчыцкай і часам хутарской маёмасці. Але, мяркуючы па глыбіні і маштабах аграрнага руху, гвалтоўны метад у ажыццяўленні іх мэт не быў вызначальным. Асноўны шлях у гэтым напрамку праходзіў праз выкарыстанне легітымных дзяржаўных устаноў (валасных, харчовых і зямельных камітэтаў), у першую чаргу на ўзроўні воласці, і нават вышэй. Разлік Часовага ўрада і грамадства на тое, што ўдзел сялянства ў камітэтах будзе ў поўнай меры садзейнічаць рэалізацыі ўрадавых праграм, асабліва ў пытаннях нарыхтоўкі прадуктаў харчавання для вайскоўцаў і гараджан, не апраўдаўся. Нягледзячы на велізарную прапагандысцкую і арганізацыйную работу Часовага ўрада па прыцягненні сялян да дзяржаўных спраў, камітэты розных узроўняў з іх удзелам не здолелі забяспечыць рэалізацыі абвешчанай манаполіі на ўраджай 1917 г. Гэта акцыя правалілася, але не з-за палітычных настрояў сялянства, а з-за несупадзення яго прыватнаўласніцкіх гаспадарча-эканамічных інтарэсаў з патрэбамі дзяржавы і астатняга грамадства. Такім чынам, нягледзячы на рэвалюцыйныя перамены, што адбыліся ў краіне з вясны па восень 1917 г., селянін-індывідуаліст па-ранейшаму саступаў селяніну-грамадзяніну.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нацыяльны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 622. В. 1. С. 2.
2. НАРБ. Ф. 60. В. 2. С. 162.
3. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Белоруссия в период подготовки социалистической революции (февраль–октябрь) / Ред. коллегия Г.С. Горбунов, Ф.А. Новиков, М.С. Кравченко и др. Мн., 1957. Т. 1.
4. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 1779. В. 1. С. 1297.
5. Речь. 1917. 21 апреля.
6. Вестник Минского губернского комиссариата. 1917. 24 марта.
7. Минская газета. 1917. 23 апреля.
8. Земля и воля. 1917. 13 июля.
9. Крестьянское движение в 1917 г. / Под ред. М.Н. Покровского, Я.А. Яковлева. М., 1927.
10. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 158.
11. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 242.
12. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 243.

13. Витебский листок. 1917. 5 июня.
14. ДАРФ. Ф. 1778. В. 1. С. 297.
15. ДАРФ. Ф. 1779. В. 1. С. 1297.
16. ДАРФ. Ф. 3666. В. 1. С. 52.
17. Минский голос. 1917. 20 мая.
18. Минский голос. 1917. 19 мая.
19. ДАРФ. Ф. 1796. В. 1. С. 70.
20. Народное слово. 1917. 19 августа.
21. ДАРФ. Ф. 1796. В. 1. С. 74.